# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

8 лютага 2017 г.
№ 4 (388)




стар. 2

**Зямля, вада, дарогі... На прыёме ў дэпутата**



стар. 6

**Аптымізацыя ў Капыльскім раёне: плюсы і мінусы**



стар. 7

**КУП — структура патрэбная. Асабліва ў прысталічным раёне**

ТЭМА ДНЯ

# АГРАТУРЫЗМ ПАВІНЕН СТАЦЬ СУМЛЕННЫМ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рэчыцкі раён, в. Мілаград

## Правілы, па якіх хутка будуць працаваць аграсядзібы, хвалююць, зразумела, у першую чаргу гаспадароў. Але не толькі іх

**Кантралюючыя органы і ўлады зацікаўлены ў тым, каб гэты від бізнесу быў празрыстым і зразумелым для ўсіх. Паняцце сельскага турызму існуе ў краіне 15 гадоў, але ж развіццё гэты від дзейнасці атрымаў у 2006 годзе, калі былі прыняты Указ № 372, які дазволіў сельскім жыхарам займацца аказаннем турыстычных паслуг афіцыйна. Сёння, кажа начальнік упраўлення спорту і турызму Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта Дзяніс Язерскі, прыйшоў час, калі ўнесці змены ў яго проста неабходна.**



— Аграсядзібы ў ідэале павінны быць элементам развіцця кластэрнай мадэлі такога віду дзейнасці. Інакш кажучы, павінен працаваць і зарабляць не толькі сам гаспадар. Гэта аб'ект, вакол якога жыве ўсё сяло і працуюць адразу некалькі суседзяў: забяспечваюць сельгаспрадуктамі, катаюць на коніку, возяць на рыбалку... Сёння ж у асобных выпадках аграсядзіба перашкаджае суседзям жыць — з-за гучных вечарын, якія адбываюцца за агароджай.

стар. 3

УМОВЫ ПРАЖЫВАННЯ

# Куды глядзяць аглядныя камісіі?

## Праз гэтыя структуры ў Мазырскім раёне даўно вырашаюцца не толькі жыллёва-камунальныя, але і сацыяльныя праблемы

**«Распішыцеся, калі ласка, што мы вас наведалі!» — «Вам абы распісаліся, а парадку як не было, так і няма!» — уздыхае пажылая жанчына. «А што здарылася?» — «Ды ў падвале цёмна, хоць бока выкалі: з ліхтарыкам па бульбу спускаюся!» — «Дык нядаўна толькі лямпачку мянялі! Няўжо зноў нехта выкруціў? Зараз электрыку патэлефаную, каб новую ўкруціў!..»**

У КВАТЭРЫ мазырчанкі Ліліі Уладзіміраўны тоўпіцца цэлая камісія — з дзясятак службовых асоб. Прадстаўнік МНС, участковы міліцыянер, работнікі сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі, энерганагляду, газавай службы і інспектар па камунальных плацяжах. Узначальвае прадстаўнічую «грамаду» кіраўнік мясцовага ЖЭУ. Кожны спецыяліст звяртае ўвагу на свой сектар работы. У такім складзе яны збіраюцца два разы на месяц, каб прайсці па «праблемных» адрасах. І пры неабходнасці аказаць людзям дапамогу, а часам і прадухіліць бяду...

Практыку аглядных камісій некалі ўвёў колішні старшыня Мазырскага райвыканкама, цяпер старшыня аблвыканкама Гомельшчыны Уладзімір Дворнік. І ўжо некалькі гадоў падобная «калегія» спецыялістаў існуе пры кожным з гарадскіх ЖЭУ. Гэтаксама збіраюцца камісіі і ў сельсаветах. «Найперш мы звяртаем увагу на ўмовы пражывання ветэранаў Вялікай Айчыннай, адзінокіх пенсіянераў і інвалідаў. А таксама людзей, што вядуць асацыяльны лад жыцця, — кажа Вячаслаў Пашвянчук, начальнік Мазырскага ЖЭУ №1. — Асобная катэгорыя — шматдзетныя сем'і, асабліва тыя, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы».

ЖЭУ №1 абслугоўвае Цэнтральны мікрараён Мазыра, дзе забудова ці не самая старая ў горадзе. З 15 тысяч насельніцтва больш за 80 працэнтаў — пенсіянеры. Сярод іх нямала адзінокіх бабуль і дзядуляў. І 22 ветэраны вайны, якіх яшчэ летась было 27...

...Іван Антонавіч Вафік ужо даўно не ўстае з ложка. Але ў свае 92 гады ветэран захоўвае ясны розум і ахвотна размаўляе з членамі камісіі. «Вы не глядзіце, што бацька ляжачы, — кажа яго дачка Таццяна Іванаўна, — з памяццю ў яго ўсё як мае быць. Я, бывае, забуду нешта — дык ён нагадвае!»

стар. 5



Фота Надзеі БУЖАН.